УДК 726.5.04 (476)

**Архітэктура прыходскіх храмаў Беларусі**

Арабей В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Аналіз сучаснага храмабудаўніцтва Беларусі дае магчымасць сцвярджаць, што сярод шырокага спектру праваслаўных пабудоў краіны прыходскія храмы з'яўляюцца найбольш распаўсюджаным тыпам і выконваюць важную місію ў духоўна-культурным развіцці вернікаў.

Пошукі вобраза праваслаўнага прыходскага храма канца XX–пачатку XXI стст. у асноўнай масе вылучаюцца зарыентаванасцю іх на гістарычныя прататыпы, што не супадае з агульнымі тэндэнцыямі сучаснай архітэктуры, у якой дамінуюць прынцыпы мадэрнізму. З аднаго боку гэта можна тлумачыць жаданнем аднаўлення страчанай пераемнасці культавай архітэктуры, характэрным для краін, якія пацярпелі ад атэістычнай барацьбы, з другога – несупадзеннем архітэктурна-мастацкіх задач царкоўнага дойлідства і сучаснага будаўніцтва. «Калі старая архітэктура ўяўляе сабою цэласны арганізм, які пераймае якасці жывой прыроды - тварэння Боскага, то эстэтыка так званай сучаснай архітэктуры дэманструе штучнае, абстрактнае аналітычнае мысленне, секулярызаваны псеўданавуковы рацыяналізм…». На першае месца ў сучасным мастацтве часта выходзяць такія якасці, як эфектнасць, арыгінальнасць, адмысловасць твору, а не прыгажосць, якая была характэрна для архітэктуры мінулага. Гэту тэндэнцыю можна бачыць на прыкладзе асобных каталіцкіх і пратэстанскіх храмаў сярэдзіны XX– пачатку XXI стст. (Францыя, Роншан, капэла Нотр-Дам-дзю-О; ЗША, Каларада, кадэцкая капэла ваенна-паветранай акадэміі; Бразілія, Бразіліа, кафедральны сабор Найсвяцейшай Панны Марыі; Італія, Рым, Юбілейная царква і інш.).

Паралельна з мадэрнісцкай скіраванасцю заходнехрысціянскага храмабудаўнцтва, цэрквы ўсходняй хрысціянскай традыцыі захоўваюць больш шчыльную сувязь са старадаўняй архітэктурай розных перыядаў (Сербія, Белград, сабор св. Савы; Грузія, Тбілісі, Свята-Троіцкі сабор; Арменія, Ерэван, Свята-Георгіеўскі сабор; Грэцыя, Афіны, Свята-Ушэсцеўская царква і інш.).

У сучасным прыходскім храмабудаўніцтве вядзецца актыўны пошук эстэтычных рашэнняў, здольных спалучыць у сабе адмысловыя рысы канкрэтнага часу існавання праваслаўнай архітэктуры і сакральнага характару культавага будынка. Пастаўленая задача з'яўляецца вельмі складанай і паказвае станоўчыя вынікі ў невялікай колькасці аб'ектаў.